# БЕЛАРУСКІЯ ПРАВАСЛАЎНЫЯ ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ Ў ФОНДАХ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

Кожны народ імкнецца на зямлі сваіх продкаў сабраць каштоўнасці, што ствараліся многімі пакаленнямі. Збор друкаваных помнікаў культуры свайго народа ў любой дзяржаве традыцыйна ажыццяўляе нацыянальная бібліятэка, якая павінна быць тым адзіным месцам, дзе можна было б атрымаць дакументы — вынік дзейнасці народа, імя якога яна носіць, або хаця б інфармацыю пра іх.

Менавіта такой канцэпцыяй у фарміраванні фондаў і стварэнні крыніц бібліяграфічнай інфармацыі кіравалася Нацыянальная бібліятэка Беларусі з першых дзён яе існавання. Універсальныя па характару, яе фонды разлічаны на задавальненне патрэб усёй нацыі, усёй дзяржавы.

У арганізацыі фондаў Бібліятэкі з самага пачатку велізарнейшую ролю адыграла дапамога ўрада, буйных бібліятэк Масквы і Ленінграда, дзякуючы чаму стала магчымым камплектаванне дарэвалюцыйнымі перыядычнымі выданнямі, набыццё фондаў дарэвалюцыйных навучальных устаноў, прыватных збораў і калекцый, выданняў Мінскай і Віцебскай духоўных семінарый, епархій з цэнтрамі ў Вільні, Гродне, Магілёве. Бібліятэка з дня заснавання атрымлівала абавязковы бясплатны экзэмпляр друкаваных выданняў, якія выходзілі ў СССР, і два беларускіх абавязковых

экзэмпляры. Арганізацыя камплектавання з розных крыніц дала магчымасць Бібліятэцы стварыць надзейны рэспубліканскі банк інфармацыі, які забяспечваў усе сферы дзейнасці, у т. л. і духоўную. Дзякуючы гэтаму ў фондах Бібліятэкі была сабрана значная калекцыя беларускіх царкоўных выданняў. Трэба адзначыць, што выдавецкая дзейнасць царквы ў дарэвалюцыйны перыяд была шырока прадстаўлена епархіяльнай перыёдыкай, богаслужбовай і багаслоўскай літаратурай, кнігамі і часопісамі для народнага чытання. Сярод выданняў беларускай праваслаўнай перыёдыкі таго часу ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі захоўваюцца:

«Вестник Виленского Православного Свято-Духовского Братства», які выдаваўся ў Вільні з 1907 да 1916 г. перыядычнасцю два разы на месяц. У часопісе змяшчаліся артыкулы па надзённых пытаннях царкоўна-грамадскага жыцця ў Расіі наогул і ў Паўночна-Заходнім краі асабліва, артыкулы па параўнальнаму багаслоўю, артыкулы і дакументы, у якіх высвятляўся і тлумачыўся лёс праваслаўя ў гэтым краі, гісторыя брацтва, хроніка царкоўна-грамадскага жыцця Паўночна-Заходняга краю, абмен думкамі паміж чытачамі «Вестника». У Бібліятэцы захоўваюцца амаль усе гадавыя камплекты за выключэннем 1912 і 1915 гг.

Сярод выданняў, якія найбольш цікавяць чытачоў, можна адзначыць «Гродненские епархиальные ведомости» — штотыднёвае выданне Гродзенскай епархіі, якое выходзіла з 1901 да 1915 г. і складалася з дзвюх частак: афіцыйнай і неафіцыйнай. У ім друкавалася хроніка епархіяльнага жыцця Паўночна-Заходняга краю і Гродзенскай епархіі ў прыватнасці. Бібліятэка мае камплекты за 1901—1906, 1910 гг.

Звесткі аб прадметах царкоўнай даўніны можна знайсці ў віленскім выданні «Известие литовского епархиального древлехранилища», якое выходзіла ў 1910 і 1914 гг. У Бібліятэцы захоўваюцца выпускі за 1910г.

З 1863 да 1872 г. штотыднёва, а далей да 1916 г. два разы ў месяц у Вільні выдаваліся «Литовские епархиальные ведомости», у якіх асвятлялася царкоўнае жыццё ў Віленскім краі.

Мінскім царкоўным гісторыка-археалагічным камітэтам у 1909—1913 гг. выпускаўся часопіс «Минская старина» (месца выдання Мінск—Вільня), які апавядаў пра старажытнасці краю. У фондах Бібліятэкі гэтае ўжо рэдкае выданне можна знайсці за 1909—1911, 1913 гг.

З 1869 па 1917 г. перыядычнасцю два разы ў месяц выдаваліся «Минские епархиальные ведомости». Выданне мела дзве часткі:



афіцыйную і неафіцыйную і шырока асвятляла жыццё Мінскай епархіі. У Бібліятэцы ёсць выпускі за ўсе гады, акрамя 1916 г.

Царкоўнаму жыццю Магілёўскай губерні былі прысвечаны «Могилевские епархиальные ведомости», якія выдаваліся ў Магілёве ў 1883—1917 гг. Да 1907 г. часопіс меў перыядычнасць тры разы, а пасля два разы ў месяц. Бібліятэка мае поўны камплект з 1884 да 1917 г.

З 1874 да 1917 г. у Віцебску выдаваліся «Полоцкие епархиальные ведомости», якія таксама мелі перыядычнасць два разы ў месяц і складаліся з дзвюх частак: афіцыйнай і неафіцыйнай. У Бібліятэцы захоўваюцца практычна ўсе выпускі, акрамя 1878 і 1882 гг.

Ёсць у Бібліятэцы і поўны камплект часопіса «Праваслаўны братчык», які ў 1910—1911 гг. штомесячна выдаваўся Мінскім брацтвам у імя свяціцеля Мікалая.

Прапанаваны агляд лічыць вычарпальным нельга. Агульнавядома, што разрабаваныя і знішчаныя ў гады Вялікай Айчыннай вайны фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, колькасна ўзноўленыя ў 1948 г., да сённяшняга часу маюць значныя прабелы. У ліку страчаных — шмат і рэлігійных выданняў. Таму ў перспектыве работы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — пытанні рэтраспектыўнага камплектавання не толькі кніжных дакументаў, але і перыядычных выданняў.

На працягу многіх год, неспрыяльных для развіцця не толькі кнігавыдавецкай, але і дыяканічнай, ці як яе цяпер называюць, сацыяльнай дзейнасці праваслаўнай царквы, духоўная асвета вернікаў адбывалася непасрэдна ў храмах. Перыяд рэлігійнага інфармацыйнага вакууму адбіўся і на фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Сведчаннем гэтага з'яўляецца тая невялікая колькасць праваслаўнай перыёдыкі за даваенныя гады, якая захоўваецца ў Бібліятэцы. Сярод выданняў таго часу заходнебеларускія выданні — орган праваслаўных беларусаў «Беларуская зарніца», «Віленскі царкоўны двухтыднёвік» за 1927—1929 гг.; «Голас праваслаўнага беларуса» — часопіс з'яўляўся органам незалежнай царкоўна-грамадскай думкі, выдаваўся ў Вільні ў 1931—1932 гг.; орган праваслаўных беларусаў царкоўна-нацыянальны двухтыднёвік «Светач Беларусі», які выходзіў у Вільні з 1930 да 1935 г.; штомесячны беларускі праваслаўны часопіс «Царква і народ», які выдаваўся там жа ў 1932—1933 гг. У фондах Бібліятэкі захоўваецца і прагрэсіўны заходнебеларускі дзіцячы царкоўны культурна-асветніцкі ілюстраваны часопіс «Снапок» за 1937 г., які выходзіў на беларускай мове ў Варшаве ў 1937—1939 гг.

Выдавецкая дзейнасць Беларускай Праваслаўнай Царквы сёння з'яўляецца працягам шматвяковай традыцыі рукапіснай і друкаванай кнігі і ўліваецца ў агульны айчынны гісторыка-культурны працэс захавання, вывучэння і публікацыі духоўнай спадчыны народа.

Так, праз паўгода пасля святкавання 1000-годдзя хрышчэння Русі, у студзені 1989 г. адрадзілася выданне часопіса «Минские Епархиальные ведомости», які не выходзіў з 1917 г. Рашэннем Сінода Беларускай Праваслаўнай Царквы са студзеня 1990 г. пачаў выдавацца новы часопіс «Вестник Белорусского экзархата». Матэрыял у ім публікуецца па жаданню аўтараў на беларускай і рускай мовах, з захаваннем асаблівасцей аўтарскай арфаграфіі ў беларускіх тэкстах. Тэматыка «Вестника Белорусского экзархата» вельмі разнастайная. Акрамя паведамленняў пра асноўныя падзеі, што адбыліся ў жыцці Праваслаўя на Беларусі — а гэта блок афіцыйнай інфармацыі, які дае чытачу ўяўленне пра погляды Царквы на галоўныя праблемы сучаснага жыцця, — часопіс публікуе вялікую колькасць матэрыялаў на гістарычную тэму. Гісторыя храмаў і жыццяпісы святых, лёс хрысціянства ў нашай айчыне сёння і многія стагоддзі назад, святаайцоўскія павучанні і малітвы, багаслоўскія артыкулы і рэпрадукцыі ікон — уся гэтая інфармацыйная разнастайнасць аб'ядноўваецца па прынцыпу тэматычных нумароў: «Інтэлігенцыя і Праваслаўе», «Шляхі і лёс народа Божага», «Праваслаўе на Белай Русі: Людзі і храмы» — галоўныя тэмы некаторых выдадзеных нумароў.

На жаль, тэхнічныя магчымасці Мінскай мітраполіі былі недастатковыя, каб выдаваць два часопісы адначасова, і выхад у свет «Ведомостей» быў прыпынены да сярэдзіны 1991 г.

Адроджаныя на тэрыторыі Беларусі епархіі выдаюць уласную перыёдыку, і сёння ўжо выходзяць у свет не толькі «Мінскія», але і «Магілёўскія», «Брэсцкія», «Навагрудскія», «Полацкія», «Гродзенскія епархіяльныя ведамасці».

Адной з галоўных задач царкоўнага друку з'яўляецца сучасная інфармацыя пра падзеі, якія адбываюцца ў Беларускай Праваслаўнай Царкве і іншых Цэрквах і рэлігійных аб'яднаннях, як у Беларусі, так і за яе межамі. У сувязі з гэтым асноўная інфармацыйная работа прыпадае на перыядычныя выданні. Яны працуюць у напрамку фарміравання хрысціянскага светапогляду чытачоў, па выхаванню іх у духу высокіх патрабаванняў хрысціянскай маралі. Менавіта такія задачы ставіў незалежны часопіс праваслаўнай моладзі «Праваслаўная думка», які выходзіў у 1989—1990 гг. у Мінску.



Выдавецкім аддзелам Беларускага Праваслаўнага Брацтва Св. Віленскіх Мучанікаў пры Свята-Петра-Паўлаўскім саборы ў 1995—1998 гг. выпускаўся бюлетэнь праваслаўнай службы навін «Ортапрэс», які ставіў мэту асвятленне ў кароткіх інфармацыйных паведамленнях рознабаковага жыцця праваслаўных цэркваў у розных рэгіёнах свету. З 1993 г. выходзіць часопіс «Праваслаўе ў Беларусі і ў свеце» (цяпер называецца «Праваслаўе»). Часопіс праваслаўных беларусаў выдаецца сумеснымі намаганнямі двух брацтваў: Беларускага Праваслаўнага Брацтва Св. Віленскіх Мучанікаў у Мінску і Кірыла-Мяфодзіеўскага Праваслаўнага Брацтва ў Беластоку. Мэта выдання — аб'яднанне праваслаўных беларусаў на глебе каштоўнасцяў Праваслаўя і царкоўнага асветніцтва. На старонках часопіса друкуюцца матэрыялы беларускіх царкоўных архіваў, якія раскіданы па ўсім свеце, гучыць беларуская пропаведзь, духоўная паэзія, высвятляюцца пытанні беларускай царкоўнай гісторыі.

У нашы дні значна павялічыўся аб'ём царкоўнай інфармацыі, паглыбілася багаслоўская праблематыка, што з'яўляецца заканамерным следствам росту актыўнасці Царквы ў грамадскім жыцці, пашырэння яе экуменічнай і міратворчай дзейнасці. Значна ўзрасла цікавасць да Праваслаўнай Царквы сярод шырокіх колаў насельніцтва, таму асабліва і значнае месца займае і царкоўны друк.

Акрамя вышэйзгаданых выданняў у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі збіраюцца і беларускія праваслаўныя газеты, сярод якіх:

«Царкоўнае слова» — выданне Беларускага Экзархата з рэдакцыяй пры Свята-Петра-Паўлаўскім саборы — выходзіць адзін раз у месяц на беларускай і рускай мовах;

«Преображение» — штомесячная праваслаўная духоўна-асветніцкая газета, заснавальнікам якой з'яўляецца Свята-Міхайлаўскі сабор г. Слуцка. Газета выходзіць на беларускай і рускай мовах;

«Наше Православие» — газета выдаецца Полацка-Віцебскай епархіяй у Віцебску і інш.

Не меншую каштоўнасць для беларускай культуры маюць дакументальныя друкаваныя і рукапісныя помнікі, створаныя беларускай дыяспарай у розных кутках свету. Фарміраванне гэтай часткі фонду мае даўнюю гісторыю. Яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны рабіліся захады па набыцці выданняў, што выходзілі з друку за мяжой, але гэты фонд рос марудна, складаўся ў асноўным з публікацый беларусаў мітраполіі. Выданні ж беларускай эміграцыі адсутнічалі, таму пытанне паўнаты фонду наогул

не магло ставіцца. Без перабольшвання можна сцвярджаць, што па сутнасці частка нацыянальнага фонду «беларускае замежжа» ў асноўным створана за апошнія 7—8 гадоў. Сярод праваслаўнага перыядычнага друку беларускага замежжа ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі можна вылучыць наступныя царкоўна-грамадскія выданні:

«Голас часу» — часопіс праваслаўных беларусаў, які выдаецца Радай Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы ў Лондане з 1989 г.

«Беларускі праваслаўны часопіс» за 1962 г., што друкаваўся ў Чыкага.

«Божым шляхам». Двухмесячны часопіс беларускае рэлігійнае думкі, які спачатку друкаваўся ў Парыжы (1947—1957 гг.), а з 1964 г. быў узноўлены ў Лондане. У Бібліятэцы захоўваецца ўключна па 1980 г.;

Рэлігійна-грамадскі часопіс праваслаўных беларусаў «Голас царквы», які выдаецца епархіяльнай управай Беларускай Аўтакефальнай царквы ў Нью-Йорку (Бруклін) з 1955 г. і да цяперашняга часу;

Часопіс Жыровіцкага праваслаўнага брацтва «Сіла веры» (Нямеччына — ЗША), які выходзіў у 1948—1950 гг.;

«ФОС». Часопіс брацтва Праваслаўнай моладзі Беластоцка-Гданьскай епархіі;

«Паведамленні рады Катэдральнага Сабору св. Кірылы Тураўскага» друкуюцца ў часопісе «Царкоўны пасланец», які выдаецца Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквой з 1979 г. у Брукліне;

«Царкоўны светач» — амерыканскі царкоўна-грамадскі часопіс, які пачаў выдавацца ў Нью-Джэрсі з 1951 г.;

«Царкоўныя навіны», заснавальнікам якога з'яўляецца Беларуская Аўтакефальная праваслаўная царква (г. Таронта). Часопіс выдаецца з 1982 г.

Выданні, якія зберагаюцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, адлюстроўваюцца ў яе даведачна-пошукавым апараце і даступныя для чытачоў. Больш шырокаму раскрыццю фондаў дапамагаюць шматлікія (звыш 500 у год) кніжныя выстаўкі, на якіх побач з іншымі экспануюцца і дакументы Беларускай Праваслаўнай Царквы, у тым ліку перыёдыка.

Папулярызацыі гэтых выданняў спрыяе і выдавецкая дзейнасць Бібліятэкі, скіраваная ў першую чаргу на выпуск бібліяграфічнай прадукцыі, якая мае дачыненне да Беларусі. У прыватнасці, публікацыі з перыядычных праваслаўных выданняў можна знайсці ў раздзеле «Рэлігія: ад старажытнасці да нашых дзён» агульнавядомага чытачам інфармацыйна-бібліяграфічнага бюлетэня «Новыя кнігі: Па старонках беларускага друку».